View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

или целым терминологическим блоком. В разговорно-речевой практике, а также в письменных источниках номенклатурный термин может онимизироваться.

## ЛИТЕРАТУРА

1. *Мезенко, А.М.* Урбанонимия Беларуси / А.М. Мезенко. – Минск: Университетское, 1991. – 167 с.
2. Православие. Словарь-справочник. Изд. 2-е, исправленное и дополненное. – М.: «ДАРЪ», 2007. – 960 с.
3. *Фасмер, М.* Этимологический словарь русского языка: В 4 т. / М. Фасмер. – М., 1987. – 2926 с.
4. *Шанский, Н.М.* Краткий этимологический словарь русского языка. Пособие для учителей / Н.М. Шанский и др. – М.: «Просвещение», 1975. – 543 с.
5. *Ожегов, С.И.* Толковый словарь русского языка / С.И. Ожегов, Н.Ю. Шведова. – М.: Азбуковник, 1997. – 944 с.
6. *Семёнова, М.* Мы – славяне!: Популярная энциклопедия / М. Семёнова. – СПб.: Издательский Дом «Азбука – классика», 2007. – 560 с.
7. *Брокгауз, Ф.А.* Энциклопедический словарь. Философия и литература. Мифология и религия. Язык и культура / Ф.А. Брокгауз, И.А. Ефрон. – М.: Изд-во Эксмо, 2003. – 592 с., илл.
8. *Кулагін, А.М.* Каталіцкія храмы на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік / А.М. Кулагін; Маст. І.І. Бокі. – 2-е выд. – Мінск: БелЭн, 2001. – 216 с.: іл.

The article deals with names of religious buildings of the Republic of Belarus. Nomenclature terms are analyzed in ecclesionyms of different religious groups.

*Поступила в редакцию 15.03.11*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Н.У. Чайка

## ЭЛІПТЫЧНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ ЎСКЛАДНЕНАЙ БУДОВЫ

У артыкуле аналізуецца сінтаксічная структура канструкцый з эліпсісам дзеяслова. Вызначаюцца сродкі пашырэня і ўскладнення сінтаксічнай структуры сказа, якія выступаюць у якасці структурна-семантычнага паказчыка. Выяўляюцца сінтаксічныя сувязі і адносіны, на аснове якіх ажыццяўляецца рэалізацыя семантыкі канструкцый з эліпсісам дзеяслова. Таксама былі вызначаны моўныя механізмы, што рэгулююць функцыянаванне канструкцый з эліпсісам дзеяслова. Сродкі пашырэння і ўскладнення структуры сказа адкрываюць новыя сінтаксічныя пазіцыі, якія могуць запаўняцца лексемамі, што стварае спрыяльныя ўмовы для функцыянавання канструкцый з эліпсісам дзеяслова.

Структурная арганізацыя канстукцый з эліпсісам дзеяслова вывучалася ў межах структурнай сінтаксічнай школы. Былі даследаваны наступныя аспекты праблемы эліпсіса:

- ✓размежаванне з'яў сінтаксічнага нуля і эліпсіса (А.Я. Сядзельнікаў, Л.І. Бурак, J.Panenova, K.Kearns, A.Wilhelm, M.Lehman і інш.);
- ✓вызначэнне інварыянтных сінтаксічных мадыфікацый (у тым ліку і эліптычных) (В.Вардуль, А.Ісаева, W.Müller, A.Corr, S.Dentler і інш.);
- ✓кваліфікацыя эліпсіса, рэдукцыі і збыткоўнасці як з'яў аднаго парадку (А.У. Грудзева, J.Jose, S.Dentler і інш.).
- ✓структура эліптычных канструкцый у параўнальным аспекце (W.Lechner, M.McShane, J.Merchant, A.Uniszewska і інш.).
- ✓параўнальнае даследаванне канструкцый з эліпсісам дзеяслова ў рускай, польскай і чэшскай мовах (M.McShane і інш.).
- ✓эліпсіс і дэтэрмінацыя (Е.М. Шыраеў, В.С. Грыгор'ева, Т.І. Мунгалава і інш.).

Нягледзячы на значную колькасць прац па праблеме, многія важныя пытанні не закраналіся ў працах вучоных. Патрабуюць сецыяльнага вывучэння структурна-сінтаксічныя ўмовы функцыянавання канструкцый з эліпсісам дзеяслова. Тэорыя інварыянтных структур [1, 2, 3, 4, 5 і інш.] дала магымасць вызначыць зыходныя мадэлі эліптычных сказаў. Аднак пры гэтым не атрымалі вывучэння сістэмныя фактары функцыянавання названых канструкцый. Адсутнасць дзеяслова ў аналізуемых канструкцыях часта надае ім неадназначны характар. Таму патрабуюць вывучэння сінтаксічныя сродкі рэалізацыі семантыкі ў канструкцыях з эліпсісам дзеяслова – паказчыкі семантыкі. Таксама неабходна выявіць узроўні арганізацыі сінтаксічных адзінак, да якіх належаць паказчыкі семантыкі. Да таго ж у мовазнаўстве не атрымала вывучэння пытанне пра сінтаксічныя адносіны, на аснове якіх рэалізуецца структурна-сэнсавае ўзаемадзеянне паміж сінтаксічнай пазіцыяй эліпсаванага выказніка і паказчыкам семантыкі, і сінтаксічныя сувязі, пасрэдніцтвам якіх названыя паказчыкі ўводзяцца ў сказ. Неабходна выявіць моўныя механізмы, якія кампаненсуюць эліпсіс дзеяслова іншымі сродкамі і гэтым самым рэгулююць рэгулююць функцыянаванне канструкцый з эліпсісам дзеяслова. Л.І. Бурак лічыць, што "кіраванне традыцыйна лічыцца адным з відаў сінтаксічнай сувязі, фармальны спосаб уключэння назоўнікаў у сінтаксічныя пабудовы" [6, с. 378-379]. Семантычнае ўзгаднене і спалучаемасць, на думку даследчыка, могуць рэалізавацца на базе фармальнага кіравання" [6, с. 359]. Аднак намі выяўлены выпадкі, калі сэнсавае ўзгадненне і спалучальнасць рэалізуюцца на аснове іншых сінтаксічных сувязей і адносін (не толькі кіравання) і пры дапамозе іншых структурных кампанентаў (не толькі семантычных) – сродкаў ускладнення і пашырэння структуры сказа, прэдыкатыўных частак складанага сказа, парцэляваных канструкцый, кампанентаў у структуры звышфразавага адзінства і інш. Сказанае вышэй абумоўлівае мэту даследавання ў артыкуле – *прааналізаваць сродкі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*пашырэння і ўскладненя сінтаксічнай структуры канструкцый з эліпсісам дзеяслова; выявіць структурна-сістэмныя механізмы функцыянавання канструкцый з эліпсісам дзеяслова.*

Назіраюцца адзінкавыя выпадкі, калі ў структуру эліптчнай канструкцыі ўваходзіць параўнальны зварот. Структурна-сэнсавае ўзаемадзеянне эліпсаванага дзеяслова і параўнальнага зварота ажыццяўляецца толькі пры наяўнасці скрытай прэдыкатыўнасці і адсутнасці паралельных кампанентаў, што параўноўваюцца. У такім выпадку параўнанне ўказвае на спосаб дзеяння і можа спалучацца з дзеясловамі абмежаванай семантыкі. Неабходна вызначыць умовы структурна-сэнсавага ўзаемадзеяння параўнальных зваротаў з сінтаксічнай пазіцыяй эліпсаванага выказніка, а таксама іх структурную арганізацыю.

Скрытая прэдыкатыўнасць параўнальных зваротаў заключаецца ў тым, што параўнальны зварот звязваецца не з асобнымі славаформамі, а са зместам усёй астатняй сказа: *Вясковы люд – у бок царквы, як на пажар* (З. Бядуля)*; Вясновы гай – птушкамі, нібы вясельнымі скрыпкамі* (М. Васілёнак); *У вясновым небе – жаўрукі, як срэбныя званочкі* (Я. Брыль). У падобных сказах эліптычная канструкцыя, дзякуючы параўнальнаму звароту, успрымаецца як цэласная сітуацыя, параўн.: *Вясковы люд бяжыць у бок царквы, як на пажар бяжыць* або *Вясновы гай пяе птушкамі, нібы пяе вясельнымі скрыпкамі* ці *У вясновым небе звіняць жаўрукі, як звіняць срэбныя званочкі*. Прэдыкатыўны кампанент у такіх канструкцыях мае скразны характар – адносіцца адначасова да асноўнай і да парўнальнай частак канструкцыі.

Уласнае параўнанне, што ўласціва канструкцыям з эліпсісам дзеяслова, фарміруе двунакіраваную сувязь – адносіць увесь зварот да выказніка: *Воблакі – над зямлёю, нібы белыя гускі* (Я. Брыль); *Знізу не відаць, што на іх, за грэбнем. А стуль усё – як на далоні. Берагі блізка – нейкія тры крокі ў бакі* (І. Мележ). Адсутнасць паралельных кампанентаў “прымушае” параўнанне ўступаць ва ўзаемадзеянне з дзеясловам.

Скрытая прэдыкатыўнасць можа рэалізавацца ў тоеснай семантыцы прэдыката: *У полі – снапы, што салдаты* (Я. Брыль)*; У лесе – дрэвы, як цымбальныя струны* (І. Канановіч). У падобных сказах параўнальныя звароты маюць сэнсавую ўзаемаабумоўленасць з эліпсаваным выказнікам і таму вызначаюць кола лексем, што могуць замяшчаць пазіцыю выказніка.

Нярэдка скрытая прэдыкатыўнасць параўнальнага зварота падразумявае выкарыстанне дзеяслова з пераносным значэннем, аднак семантыка эліптычнай канструкцыі пры гэтым выразная: *Дзятлік еты і Глушак. Як каршакі, следавацельно, удваіх – каля адной* (І.Мележ); *Сонца за Нёманам – як праз закапцелае шкло* (Я. Брыль).

Часам скрытая прэдыкатыўнасць рэалізуецца ў канструкцыях з кантэкстуальным эліпсісам. Прычым у падобных сказах назіраюцца паралельныя кампаненты – прадмет парўнання. Узаемадзеянне памж эліпсаваным выказнікам і прадметам параўнання найбольш моцнае, а паміж

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

эліпсаваным выказнікам паслабленае: *На зайдрасць усім жыць будзем! Удваіх – дружно, шчасліво, як ніхто* (І. Мележ).

Як паказалі даследаванні, назіраюцца адзінкавыя выпадкі эліптычных канструкцый з параўнальнымі зваротамі – са скрытай прэдыкатыўнасцю і адсутнасцю паралельных кампанентаў (29%), з адсутнасцю скрытай прэдыкатыўнасці і паралельных кампанентаў (34%), з адсутнасцю скрытай прэдыкатыўнасці і наяўнасцю паралельных кампанентаў (37%). Аднак структурна-сэнсавае ўзаемдзеянне магчыма толькі паміж сінтаксічнай пазіцыяй эліпсаванага выказніка і параўнальным зваротам пры наяўнасці скрытай прэдыкатыўнасці і адсутнасцю паралельных кампанентаў. Падобныя сінтаксічныя ўмовы дазваляюць акрэсліваць кола лексем, якія могуць запаўняць сінтасіную пазіцыю эліпсаванага выказніка.

Структура параўнальных зваротаў не вызначаецца разнастайнасцю: гэта пераважна адзіночныя развітыя або неразвітыя параўнані, звязаныя са сказам параўнальнымі злучнікамі.

Параўнальны зварот можа ўзаемадзейнічаць з сінтаксічнай пазіцыяй выказніка толькі пры ўмове, калі набывае скрытую прэдыкатыўнасць і калі адсутнічаюць паралельныя кампанент. Натуральна, што такая прэдыкатыўнасць не самастойная: параўнальны зварот не мае самастойных прэдыкатыўных катэгорый, яны спраецыраваны на выражаную прэдыкатыўнасць асноўнай часткі сказа. Аднак скрытая прэдыкатыўнасць падразумявае не толькі агульны прэдыкатыўна- катэгарыяльны план асноўнай часткі сказа і параўнання, а і тоесную семантыку прэдыкатаў асноўнай часткі параўнальнай. Атрымліваецца, што скрыты прэдыкат у параўнальным звароце больш выразны, напрыклад: *што салдаты стаяць, як цымбальныя струны звіняць*. Значэнне эліпсаванага дзеяслова рэалізуецца на аснове семантычнай тоеснасці скрытай і эліпсаванай прэдыкатыўнасці. Адсутнасць паралельных кампанентаў падразумявае прамое структурна-сэнсавае ўзаемадзеянне эліпсаванага дзеяслова з параўнанем.

Такім чынам, параўнальная сувязь пры наяўнасці скрытай прэдыкатыўнасці з'яўляецца базай для ўзаемадзеяння кампанентаў эліптычнага сказа, што абумоўлена **структурна-сэнсавымі механізмамі**. Аднак падобныя выпадкі назіраюцца выключна рэдка (3% ад агульнай колькасці фактычнага матэрыялу).

У творах мастацкай літаратуры і публіцыстыцы назіраюца выключна рэдкія выпдкі, калі ў структуру эліптычнага сказа ўваходзяць **звароткі.** Інтрадуктыўная сінтаксічная сувязь з'яўляецца паслабленай, і таму паміж эліпсаваным дзеясловам і звароткам ажыццяўляецца нязначнае сэнсавае ўзаемадзеянне. Паслабленае сэнсавае ўзаемадзеянне паміж эліпсаваным выказнікам і зваротам не здольна вызначыць лексіка-семантычную групу дзеяслова. Паказчыкам семантыкі ў эліптычных канструцыях са зваротам выступаюць кампаненты з акалічеасным і аб'ектным значэннем, а звароткі ў некаторых выпадках толькі канкрэтызуюць дзеяслоўную лексему ўнутры лексіка-семтычнай групы: *Хутчэй да нас, птушкі, чародамі доўгімі!* (А.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Бажко). Зваротак здольны аддыферэнцыраваць дзеянне, уласцівае адушаўлёнаму або неадушаўлёнаму суб'екту: *Ты, наша песня, – ад вёскі да вёскі* (П. Броўка). Неабходна выявіць умовы і ступень структурна-сэнсавага ўзаемадзеяння паміж звароткам і сінтаксічнай пазіцыяй выказніка, а таксама іх структурную арганізацыю.

Звароткі ў эліптычных сказах зрэдку адмяжоўваюць семантычныя функцыі кампанентаў, напрыклад аб'екта і лакатыва: *Я – да цябе ізноў, мой Нёман родны* (ЛіМ); *Я – да цябе, Мікола. З просьбай* (Г.Каржанеўская). Зваротак і парцэляваная канструкцыя выконваюць функцыю структурна-семантычнга паказчыка.

Звароткі могуць указваць на няпэўную асобу, і ў такім выпадку яны могуць выражацца і іншымі формамі – назоўнікамі ў форме ўскосных склонаў з прыназоўнікамі, якія змяшчаюць пры сабе і імператыўныя выклічнікі: *Гэй, у лодцы! Ану – да берага* (Г. Марчук). Указанне на няпэўную асобу прз месца яе знаходжання і вызначае канкрэтнае значэнне эліпсаванага дзеяслова ў межах лексіка – семантычнай групы руху.

Як паказалі даследаванні, канструкцыі з эліпсісам дзеяслова зрэдку змяшаюць у структуры звароткі (1% ад агульнай колькасці фактычнага матэрыялу) з указаннем на канкрэтную асобу (78%) і без указання на канкрэтную асобу (22%). Сэнсавае ўзаемадзеянне паміж эліпсаваным выказнікам і звароткам ажыццяўляецца на аснове інтрадуктыўнай сінтаксічнай сувязі, мае паслаблены характар. Пры гэтым звароткі ўдакладняюць значэнне эліпсаванага дзеяслова толькі ў межах пэўнай лексіка-семантычнай групы, і гэта вызначаецца харктарам суб'екта (на яго ўказвае зваротак). Звароткі ў эліптычных сказах маюць неразвітую структуру і выражаюцца тыповымі сродкамі. Функцыянаванне эліптычных сказаў са звароткамі рэгулюецца **сэнсавымі** моўнымі механізмамі.

Зрэдку назіраюцца эліптычныя канструкцыі **з устаўнымі канструкцыямі**. Аб'ектыўна-паясняльная функцыя ўстаўных канструкцый дазваляе ім указваць на абставіны, што суправаджаюць асноўнае дзеянне, выражанае эліпсаваным дзеясловам. Аднак характар сінтасічнай сувязі – інтрадуктыўная – прадугледжвае ўвод у сказ граматычна незалежнай канструкцыі, свабоднай ў структурным і семантычным плане, якая змяшчае дадатковае ўдакладненне ці тлумачэнне эліпсаванага дзеяслова. Названыя канструкцыі прызначаны павялічваць змястоўна-інфарматыўны аспект сінтаксічнай адзінкі: яны могуць каменціраваць змест не толькі ўсяго сказа, а і асобных кампанентаў, у прыватнасці эліпсаванага дзеяслова. Неабходна выявіць сінтаксічныя ўмовы, пры якіх ажыццяўляецца сэнсавае ўзаемадзеянне паміж устаўнымі канструкцыямі і сінтаксічнай пазіцыяй эліпсаванага выказніка.

Інтрадуктыўная сінтаксічная сувязь абмяжоўвае ўзаемадзеянне ўстаўной канструкцыі з сінтаксічнай пазіцыяй эліпсаванага выказніка толькі сэнсавым узроўнем: *Сямён Пятровіч – малады настаўнік (дзе поездам, дзе падводай) – да свайго новага месца працы* ("Настаўніцкая газета"). Неабходна адначыць,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

што камапанент *да новага месца працы* шматфункцыянальны: асноўная яго семантычная функцыя – лакатыў, аднак пры пэўных кантэкстуальных умовах ён можа выконваць функцыю аб'екта. У дадзеным выпадку ўстаўная канструкцыя мае дыферэнцыяльны характар: яна можа ўзаемадзейнічаць толькі з дзеясловам са значэннем перамяшчэння ў прасторы. Такім чынам канкрэтызуюцца семантычныя і сінтаксічныя функцыі астатніх кампаненаў сказа.

Часам устаўныя канструкцыі могуць набываць структуру прэдыкатыўнай адзінкі – простай або складанай. Такія канструкцыі ўказваюць, як правіла, на абставіны, якія абумоўліваюць або суправаджаюць асноўнае дзеянне. У падобных сказах устаўная канструкцыя звычайна змяшчае лексему, што апушчана ў сказе, напрыклад: *У Петразаводску Наталля Прушынская хадзіла ў дзіцячы сад, закончыла першы клас. У 1949 годзе Наталля з маці і братам – зноў у Гомель (а вярнуцца іх прымусілі абставіны: бацьку перавялі на працу на Гомсельмаш)* (ЛіМ); *Дзяўчына бацькам – нічога (У Алены не было звычкі расказваць пра свае справы)* (Л.В. Дранько-Майсюк). Такія канструкцыі могуць уключацца ў сказ пры дапамозе злучнікаў (у прыватнасці злучальнага злучніка *а*, які мае не граматычны, а змястоўна-асацыятыўны характар) або бяззлучнікавым спосабам.

Назіраюцца эліптычныя канструкцыі, у якіх устаўная канструкцыя паясняе змест усяго эліптычнага сказа. Аднак у падобных выпадках канкрэтызуецца лексема ў межах пэўнай лексіка-семантычнай групы, бо на агульную семантыку, у прыватнасці перамяшчэння ў прасторы, указвае акалічнасць са значэннем дынамічнай лакалізацыі: *Дзям'ян з дачкой Анелькай – у Краснагорку (яго ўзяўся падвезці сусед Панцялей)* (А. Кулакоўскі).

Устаўная канструкцыя часам можа змяшчаць лексему, якая з'яўляецца сінанімічнай у адносінах да эліпсаванага дзеяслова, і пры гэтым семантыка эліптычнай канструкцыі становіцца надзвычай выразнай: *Хлопцы дружнай грамадою – у бок Нёмана (а яны любілі прагульвацца вечарамі)* ("Мы і час"). У дадзеным выпадку эліптычная канструкцыя набывае фому мімалётнай заўвагі – гэтаму спрыяе злучнік *а*, які набывае змястоўна-асацыятыўны характар.

Устаўныя канструкцыі са значэнем мімалётнай заўвагі могуць змяшчаць лексему, што выступае не толькі сінанімічнай у адносінах да эліпсаванай, а і дубліруе яе: *Бабуля ўвесь час – пра даваеннае мінулае пасёлка (а ёй было што расказаць)* ("Настаўнік"); *Іван Сідаравіч пра ўсё – з інтарэсам (а слухаць ён любіў)* ("Белая Русь"). Семантычная пераемнасць лексем – *эліпсаваны дзеяслоў – выражаны дзеяслоў* – ліквідуюць зместавую неадназначнасць і гэтым самым ствараюць спрыяльныя ўмовы для функцыянаваня эліптычнай канструкцыі.

Як бачна, сэнсавае ўзаемадзеянне паміж эліпсаваным дзеясловам і ўстаўнымі канструкцыямі абумоўлена іх функцыяй – аб'ектыўна-паясняльнай. Гэта істотна адрознівае іх ад пабочных канструкцый, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выступаюць як мадальна-ацэначны кампанент сказа і таму сэнсавае ўзаемадеянне паміж імі і астатняй часткай сказа не адбываецца. Аб'ектыўна-паясняльная функцыя рэалізуецца ва ўдакладненні, паясненні, дапаўненні асноўнага зместу сказа, а сама ўстаўная канструкцыя ўказвае на спосаб працякання працэсу (45%) , выступае ў якасці мімалётнай заўвагі (13%) або змяшчае сінанімічную ў адносінах да эліпсаванай лексему (15%) ці нават дубліруе яе (27%).

Структура ўстаўных канструкцый мае разнастайны характар. Гэта могуць быць асобныя кампаненты з паясняльна-ўдакладняльным значэннем (яны ўказваюць пераважна на спосаб дзеяння), а таксама прэдыкатыўныя адзінкі простыя паводле структуры. Звязваюцца ўстаўныя канструкцыі з астатняй часткай сказа пры дапамозе гіпатаксічных або паратаксічных злучнікаў, якія набываюць змястоўна-асацыятыўны характар, а таксама бяззлучнікавым спосабам. Устаўная канструкцыя можа афармляцца як самастойная прэдыкатыўная адзінка, аднак характар сінтаксічных і сэнсавых адносін пры гэтым не мяняецца.

Як бачна, эліптычныя канструкцыі з устаўнымі канструкцыямі назіраюца надзвычай рэдка (2% ад агульнай колькасці фактычнага матэрыялу). Рэдкасць функцыянавання падобных канстукцый абумоўлена іх структурна-сэнсавымі асаблівасцямі: паслабленым характарам сінтаксічнай сувязі і магчымасцю ўступаць у сэнсавае ўзаемадзеяне толькі з нязначнай колькасцю ўстаўных канструкцый.

Як паказалі даследаванні, асноўным фактарам функцыянавання эліптычных канструкцый з эліпсісам дзеяслова ўскладненай будовы выступае структурна-сэнсавае (эліптычныя сказы з аднароднымі і адасобленымі членамі) або сэнсавае (эліптычныя сказы са зваroткамі і ўстаўнымі канструкцыямі) узаемадзеянне паміж эліпсаваным выказнікам і сродкамі ўскладнення структуры сказа, што ажыцяўляецца на аснове рознай сінтаксічнай сувязі – паратаксічнай (18%), паўпрэдыкатыўнай (37%), далучальнай (9%), параўнальнай (18%), інтрадуктыўай (18%). Інтрадуктыўная сінтаксічная сувязь характарызуецца толькі сэнсавай узаемабумоўленасцю. **Структурна-сэнсавыя** моўныя механізмы спрыяюць кампенсацыі эліпсіса шляхам пашырэння, разгортваня або ўскладнення структуры сказа рознымі сінтаксічнымі пазіцыямі – адапланавымі, разнапланавымі, свабоднымі і абумоўленымі, са скрытай прэдыкатыўнасцю і інш. Закон семантычнага ўзгаднення рэгулюе найбольш эфектыўнае выкарыстанне моўных сродкаў у эліптычных сінтаксічных канструкцыях розных відаў.

ЛІТАРАТУРА

1. *Вардуль, И.Ф.* К вопросу о явлении эллипсиса / И.Ф. Вардуль // Инвариантные синтаксические значения и структура предложения : докл. на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

конф. по теорет. проблемам синтаксиса / Акад. наук СССР, Ин-т языкознания; отв. ред. Н.Д. Арутюнова. – М., 1969. – С. 59–70.
2. *Исаева, Е.* Запрещающие факторы эллипсиса подлежащего во втором компоненте сложносочиненного предложения / Е. Исаева // Сборник научно-методических материалов к лекциям для слушателей ФПК: в помощь преподавателю русского языка как иностранного : в 2 ч. / Ин-т рус. яз. ; редкол.: Ю.А. Бельчиков [и др.]. – М., 1982. – Ч. 2. – С. 257–270.
3. *Müller, W.* Die real existierenden grammatischen Ellipsen und die Norm: eine Bestandsaufnahme / W. Müller // Sprachwissenschaft. – 1990. – Bd. 15, H. 3/4. – S. 241–366.
4. *Corr, A.* Ellipsen : Untersuchungen zu Elliptizität und elliptischen Sprachgebrauch / A. Corr. – Saarbrücken : Verl. Dr. Müller, 2008. – 102 S.
5. *Dentler, S.* Verb und Ellipse im heutigen Deutsch : zum «Fehlen» verbhängiger Bestimmungen in Theorie und Praxis / S. Dentler. – Göteborg : Univ., 1990. – 106 S.
6. *Бурак, Л.І.* Далучэнне ў сучаснай беларускай мове / Л.І. Бурак ; навук. рэд. М.А. Жыдовіч. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1975. – 256 с.

The syntactic structure of constructions with elliptical verbs is analyzed in the article. The means of widening and complication of the syntactical sentence structure which perform as a structural-semantic indicator are determined here. The syntactic connections and relations are revealed on the basis of which the realization of semantic constructions with ellipse of the verb is fulfilled.

The language mechanisms that regulate the functioning of constructions with elliptical verbs were also identified.

*Поступила в редакцию 14.03.11*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ